ЗАЦВЯРДЖАЮ
Загадчык сектара культуры
Іўеўскага райвыканкама
С.В.Кішкель

Інструкцыя аб парадку арганізацыі
і правядзення раённага агляду-конкурсу
культарганізатараў "Гульнёвы кірмаш"

1. Дадзеная інструцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення раённага агляду-конкурсу культарганізатараў "Гульнёвы кірмаш" (далей – агляд-конкурс).
2. Мэтамі і задачамі агляду-конкурсу з'яўляюцца: папулярызацыя і актывізацыя гульнёвага жанру ў раёне; павышэнне прафесійнага ўзроўню і выканальніцкага майстэрства культарганізатараў, вядучых сюжэтна-гульнёвых праграм; адраджэнне і развіцце традыцыйных народных гульняў, стварэнне новых гульнёва-забаўляльных праграм і далейшае выкарыстанне іх ў сучасных мерапрыемствах; прапаганда беларускай народнай гульні, садзейнічанне выяўленню, вывучэнню і распаўсюджванню разнастайных форм гульнёвага жанру, далучэнню насельніцства да розных форм дасугавай дзейнасці, абагульненню існуючага вопыту, яго папулярызацыі і ўкараненню ў практыку клубнай работы.
3. Раённы агляд-конкурс сюжэтна-гульнёвых праграм адбудзецца **29 сакавіка 2024г.** ў Іўеўскім цэнтры культуры і вольнага часу.
4. Сюжэтна-гульнёвыя праграмы на агляд-конкурс павінны быць прадстаўлены Іўеўскім цэнтрам культуры і вольнага часу, аддзеламі і сектарамі культурна-масавай і асветніцкай работы г.п.Юрацішкі, аграгарадкоў Геранёны, Лаздуны1, Ліпнішкі, Суботнікі, Трабы, Морына, Дайліды, Лелюкі, вёскі Бакшты.
5. Працягласць сюжэтна-гульнёвай праграмы **не павінна перавышаць 20 хвілін**.
6. На агляд-конкурс прадстаўляюцца анімацыйныя, гульнёва-пазнавальня сюжэтна-забаўляльныя, тэматычныя, фальклорныя, спартыўныя, гумарыстычныя праграмы для розных узроставых катэгорый насельніцтва.
7. Сцэнарый праграмы неабходна даслаць у аддзел метадычнай работы ДУК "Іўеўскі цэнтр культуры і вольнага часу" **да 20 сакавіка 2024г.**
8. Пры падвядзенні вынікаў агляду-конкурсу ўлічваецца:

артыстызм, арыгінальнасць выканання, сцэнічная культура і ўзровень выканальніцкага майстэрства вядучых сюжэтна-гульнёвых праграм;
выкарыстанне сучаснага і традыцыйнага мясцовага матэрыялу;
мастацкае афармленне (эстэтыка рэквізіту).

9. Журы раённага агляду-конкурсу вызначае пераможцаў у намінацыях "Лепшая фальклорныя праграма"; "Лепшая праграма для дарослых"; "Лепшая праграма для дзяцей", ўзнагароджвае іх ў кожнай намінацыі дыпломамі I, II, III ступені і прызамі.
10. Журы пакідае за сабой права падзяляць II, III месцы, або ўводзіць дадатковыя ўзнагароды.